# * § 1–0. Паходжанне чалавека. Прырода і людзі

**1. Прарадзіма чалавека.** На цяперашні час выяўлена мноства рэштак шкілетаў старажытных людзей. Самыя старажытныя знойдзены ў Афрыцы, а дакладней, на тэрыторыі цяперашніх Эфіопіі, Кеніі, Танзаніі, дзе з поўначы на поўдзень праходзіць грандыёзны разлом зямной кары — Вялікі Афрыканскі рыфт, што ўтварыўся ў прамежку часу паміж 15 і 5 млн гадоў таму. Высокая вулканічная і тэктанічная актыўнасць, што ўзнікла тут, прывяла тады да шырокага агалення ўранавых руд і да значнага павышэння натуральнай радыеактыўнасці. У продкаў цяперашніх малпаў, што ў мностве жылі тады на гэтай тэрыторыі, пачало нараджацца патомства з прыроджанымі дэфектамі: з меншай фізічнай моцай, павялічаным чэрапам, пазбаўленым магутных іклаў. І гэты наш продак не здолеў бы выжыць, калі б не знайшоў замену для таго, што адабрала ў яго радыяцыя. Замена была знойдзена: сістэматычны выраб і выкарыстанне каменных прылад рукамі, што вызваліліся дзякуючы прамахаджэнню, і актыўная ўзаемадапамога — глеба для фарміравання грамадскіх сувязей. Пераход да першапачатковых формаў працы заняў каля 2 млн гадоў, але ён уратаваў продка чалавека ад гібелі.

Вучоных таксама хвалюе пытанне наконт таго, дзе менавіта знаходзіцца радзіма сучаснага чалавека. На думку даследчыкаў, сучасныя людзі (*Homo sapiens*, або неаантрапы) утварыліся 200–300 тыс. гадоў таму. «Калыскай» сучасных людзей лічыцца Афрыка. Паводле адной з версій, месцам іх паходжання з'яўляецца поўдзень кантынента, паводле іншых — усход або поўнач.

> Знайдзіце ў сетцы Інтэрнэт інфармацыю пра палеміку вучоных наконт прарадзімы сучаснага чалавека. Чый пункт погляду здаецца вам больш пераканаўчым?

**2. Эвалюцыя чалавека і фактары, якія яе абумовілі.**

**2.1.** Прыблізна 3,5 млн гадоў таму ў Афрыцы жылі *аўстралапітэкі* — паўднёвыя малпы. Яны мелі невялікі мозг і масіўныя сківіцы, але ўжо маглі перасоўвацца з выпрастанай паставай і трымаць у руках дручок або ка-

мень. Вучоныя лічаць, што першыя каменныя прылады працы з’явіліся каля 2 млн гадоў таму. Гэта былі камяні з вострымі краямі і адшчэпы ад іх. Такімі прыладамі можна было зрэзаць галіну, зняць шкуру з забітай жывёлы, раскалоць костку або выкапаць з зямлі корань. Той, хто вырабіў іх, атрымаў найменне *«чалавек умелы» (homo habilis)*. Цяпер яго лічаць першым прадстаўніком чалавечага роду. «Чалавек умелы» перасоўваўся на нагах, а кісці яго рук былі прыстасаваны для таго, каб не толькі трымаць дручок або камень, але і вырабляць прылады. Гаварыць гэтыя старажытныя людзі яшчэ не ўмелі: быццам малпы, яны падавалі адно аднаму сігналы крыкамі, жэстамі, грымасамі. Характарыстыкі чалавека ўмелага: аб’ём мозгу — 500–640 см$^3$; рост — 1,0–1,5 м; вага — каля 30–50 кг; рацыён — у асноўным вегетарыянскі.

Прыкладна 1,5–0,8 млн гадоў таму з’явіўся новы від — *«чалавек прамаходзячы» (homo erectus)*, пітэкантрап, або малпачалавек. Гэтая істота ўсё яшчэ нагадвала сваіх продкаў — жывёл. Яна была пакрыта поўсцю, мела нізкі лоб і надброўныя дугі, якія моцна выдаваліся наперад. Але памер яе мозгу быў ужо досыць вялікі і набліжаўся да памеру мозгу сучаснага чалавека. «Чалавек прамаходзячы» навучыўся рабіць розныя прылады з каменю — буйны́я рубілы правільнай формы, скрабкі, разцы. Такімі прыладамі можна было сячы, рэзаць, габляваць, капаць, забіваць жывёл, здымаць з іх шкуры, разбіраць тушы. Аб’ём мозгу некарлікавых формаў «чалавека прамаходзячага» дасягаў 900–1200 см$^3$.

Развіццё працоўных навыкаў, здольнасць думаць, планаваць сваю дзейнасць дазволілі гэтым людзям прыстасавацца да жыцця ў розных кліматычных умовах. Яны жылі ў халодных абласцях Паўночнага Кітая і Еўропы, у тропіках вострава Ява, стэпах Афрыкі. У час існавання «чалавека прамаходзячага» пачаўся ледавіковы перыяд. У выніку ўтварэння ледавікоў панізіўся ўзровень Сусветнага акіяна, паміж падзеленымі раней вадой участкамі сушы ўтварыліся сухапутныя «масты», якімі людзі маглі прайсці, напрыклад, на востраў Ява, дзе былі знойдзеныя першыя косткі пітэкантрапа.

Гэтыя людзі ўжо ўмелі гаварыць. І ўсё ж і іх фізічнае развіццё, і развіццё культуры ішло дужа марудна: пітэкантрапы, як і прылады працы, што яны стваралі, амаль без змен праіснавалі каля 1 млн гадоў.

Ледавік часам наступаў з поўначы, часам адступаў; клімат стаў халаднейшы, а ў паўднёвых раёнах — вільгатнейшы. Прырода ставіла перад людзьмі новыя задачы, якія яны маглі вырашаць, толькі развіваючы сваю яшчэ вельмі простую культуру, назапашваючы і аналізуючы досвед. Уздзеянне прыроднага атачэння і ўскладненне дзейнасці людзей прывялі да з'яўлення каля 300 тыс. гадоў таму старажытнай разнавіднасці «чалавека разумнага» — *неандэртальца* (ад назвы германскай даліны Неандэрталь, дзе ўпершыню былі знойдзены яго астанкі). Ён ужо мала адрозніваўся ад сучаснага чалавека, хоць і быў груба складзены, меў нізкі лоб і скошанае падбароддзе.

Неандэртальцы пачалі засяляць раней бязлюдныя вобласці поўдня Еўропы, Азіі, Афрыкі. Яны ўдасканалілі прылады працы, вынайдзеныя пітэкантрапамі. Форма тых прылад зрабілася больш правільнай і разнастайнай. Неандэртальцы насілі адзенне са шкур і ўмелі будаваць простыя жытлы, а каля 60 тыс. гадоў таму навучыліся здабываць агонь.

Цяпер яшчэ не зусім зразумела, як адбывалася змена неандэртальца на чалавека сучаснага тыпу. Вядома, што ён з'явіўся нібы знянацку ў Еўропе, Паўднёва-Усходняй Азіі і Афрыцы. У Палесціне знойдзены шкілеты неандэртальцаў, больш развітых у параўнанні з іншымі сваімі суродзічамі. Яны ўжо мелі прыкметы чалавека, якога раней называлі *краманьёнцам*, а цяпер аддаюць перавагу больш агульнай назве — «чалавек сучаснага тыпу». Яго называюць па-латыні *homo sapiens sapiens* — нібыта «чалавек двойчы разумны», у параўнанні з неандэртальцам, які ўсяго толькі *homo sapiens neandertalis* — «чалавек разумны неандэртальскі».

Згодна з даследаваннямі ДНК, станаўленне чалавека сучаснага тыпу завяршылася каля 40 тыс. гадоў таму. Пры гэтым чалавецтва ўтварылася ад нешматлікай

групы людзей (першапачатковая папуляцыя — не больш за 10 тыс. асобін), якая жыла меркавана ў Афрыцы 280–40 тыс. гадоў таму. Людзі, што выцеснілі неандэртальцаў 40–30 тыс. гадоў таму, ужо не мелі рысаў, што надавалі іх папярэднікам трохі зверападобны выгляд: іх рукі сталі менш магутныя, лоб павышэў, з'явіўся падбароддзевы выступ. Людзі жылі цяпер не толькі ў пячорах або гротах, але і на стаянках, у трывалых жытлах. Матэрыялам для пабудоў, відавочна, часта служылі дрэва і шкуры, да нас дайшлі рэшткі паўзямлянак з костак мамантаў.

Трэба разумець, што эвалюцыйны шлях чалавека не быў лінейным. Разнастайныя галіны на генеалагічным дрэве чалавецтва перапляталіся, іншыя адміралі, трэція доўга развіваліся незалежна і далі пачатак новым відам або падвідам.

Чым была выклікана эвалюцыя старажытных прыматаў, што прывяла ў выніку да фарміравання высокаразвітых істот, здольных думаць і ствараць новае? Існуюць розныя пункты погляду на гэтае пытанне. Адзін з іх — мутацыйная тэорыя. Згодна з ёю мутацыі, што прывялі да памяншэння фізічнай моцы, знікнення іклаў і да т. п., запатрабавалі ад далёкіх продкаў чалавека шукаць іншыя шляхі выжывання ў атачэнні драпежнікаў у неспрыяльных прыродных умовах. Выйсце было знойдзена ў сістэматычным вырабе і прымяненні прылад працы рукамі, што вызваліліся дзякуючы прамахаджэнню. Яшчэ адзін спосаб супрацьстаяння знешнім выклікам палягаў у развіцці сацыяльных сувязей: актыўнай узаемадапамозе і калектыўнай арганізацыі працы.

1. Складзіце спіс крытэрыяў, паводле якіх можна адсачыць эвалюцыю старажытных людзей.
2. Якімі шляхамі продкі чалавека маглі абараніцца ад неспрыяльных умоў надвор'я?
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія яшчэ існуюць версіі, што тлумачаць эвалюцыю чалавека.

**2.2.** *З работы Ф. Энгельса «Роля працы ў працэсе ператварэння малпы ў чалавека».*

Праца — крыніца ўсякага багацця, сцвярджаюць палітэканомы. Яна сапраўды з'яўляецца такой разам з прыродай, што дае ёй матэрыял, які праца ператварае ў багацце. Але яна яшчэ і нешта бясконца большае за гэта. Праца — першая асноўная ўмова ўсяго чалавечага

жыцця, і прытым у такой ступені, што мы ў вядомым сэнсе маем сказаць: праца стварыла самога чалавека.

Пад уплывам перадусім свайго ладу жыцця, які патрабуе, каб падчас лазання рукі выконвалі іншыя функцыі, чым ногі, малпы пачалі адвучвацца ад дапамогі рук, ходзячы па зямлі, і пачалі засвойваць усё больш і больш прамую хаду. Гэтым быў зроблены вырашальны крок для пераходу ад малпы да чалавека.

Толькі дзякуючы працы, дзякуючы прыстасаванню да ўсё новых аперацый, дзякуючы перадачы ў спадчыну дасягнутага такім чынам асаблівага развіцця цягліц, звязак, дзякуючы ўсё новаму выкарыстанню гэтых перададзеных у спадчыну ўдасканаленняў — толькі дзякуючы ўсяму гэтаму чалавечая рука дасягнула той высокай ступені дасканаласці, на якой яна здолела, нібы чарадзейнай сілай, выклікаць да жыцця карціны Рафаэля, музыку Паганіні.

Панаванне над прыродай пачалося разам з развіццём рукі, разам з працай і на кожным новым кроку пашырала кругагляд чалавека. У прадметах прыроды ён няспынна адкрываў новыя, раней невядомыя ўласцівасці.

З іншага боку, развіццё працы па неабходнасці спрыяла цяснейшаму згуртаванню членаў грамадства, бо дзякуючы яму сталі больш частыя выпадкі ўзаемнай падтрымкі, супольнай дзейнасці, і стала яснейшым усведамленне карысці ад гэтай сумеснай дзейнасці для кожнага асобнага члена грамадства.

Коратка кажучы, у пэўны момант свайго фарміравання людзі прыйшлі да патрэбы нешта сказаць адно аднаму. Патрэба стварыла сабе свой орган: неразвітая гартань малпы павольна, але няўхільна пераўтваралася шляхам мадуляцыі для ўсё больш развітой мадуляцыі, а органы рота пакрысе навучваліся вымаўляць адзін членападзельны гук за другім.

Спачатку праца, а пазней разам з ёй і выразнае маўленне былі двума найгалоўнейшымі стымуламі. Пад іх уплывам мозг малпы паступова ператварыўся ў чалавечы мозг, які, пры ўсім сваім падабенстве з малпавым, далёка пераўзыходзіць яго велічынёй і дасканаласцю.

Развіццё мозгу і падпарадкаваных яму пачуццяў, здольнасці да абстрактнага мыслення, а таксама свядомасці, якая ўсё больш і больш прасвятлялася, у сваю чаргу, уздзейнічала на працу і на маўленне, даючы ім абодвум усё новыя і новыя штуршкі да далейшага развіцця.

Праца пачынаецца з вырабу прылад. А што ўяўляюць сабой самыя старажытныя прылады працы, якія мы знаходзім? Гэтыя прылады ўяўляюць сабой прылады палявання і рыбалоўства; першыя з'яўляюцца адначасова і зброяй. Але паляванне і рыбалоўства азначаюць пераход ад выключнага ўжывання раслiннай ежы да спажывання разам з ёй і мяса, а гэта значыць новы важны крок на шляху да ператварэння ў чалавека. Ужыванне мясной ежы прывяло да двух новых дасягненняў, якія маюць вырашальнае значэнне: да карыстання агнём і прыручэння жывёл.

Чалавек не толькі навучыўся есці ўсё ядомае — ён таксама навучыўся і жыць ва ўсякім клімаце. Ён распаўсюдзіўся па ўсёй прыдатнай для жыцця зямлі, ён адзіная жывёла, здольная зрабіць гэта самастойна.

А пераход ад раўнамерна гарачага клімату першапачатковай радзімы ў халаднейшыя краіны, дзе год дзеліцца на зіму і лета, стварыў новыя патрэбы, патрэбы ў жытле і адзенні для абароны ад холаду і вільгаці, стварыў, такім чынам, новыя галіны працы і разам з тым новыя віды дзейнасці, якія ўсё больш аддалялі чалавека ад жывёлы.

Дзякуючы сумеснай дзейнасці рукі, органаў маўлення і мозгу не толькі ў кожнага паасобку, але таксама і ў грамадстве людзі набылі здольнасць выконваць усё больш складаныя аперацыі, ставіць сабе ўсё вышэйшыя мэты і дасягаць іх. Сама праца рабілася ад пакалення да пакалення больш разнастайная, больш дасканалая, больш шматбаковая. Да палявання і жывёлагадоўлі далалося земляробства, затым прадзенне і ткацтва, апрацоўка металаў, ганчарства, мараплаўства. Апроч гандлю і рамёстваў з'явіліся, нарэшце, мастацтва і навука; з плямён развіліся нацыі і дзяржавы.

1. Якія яшчэ пункты погляду на пытанні эвалюцыі старажытных людзей вам вядомыя?
2. Якія фактары, на вашу думку, абумовілі эвалюцыю чалавека?
3. На аснове фрагмента працы Ф. Энгельса «Роля працы ў працэсе ператварэння малпы ў чалавека» складзіце схему (лагічны ланцужок), якая пакажа ролю працы ў эвалюцыі чалавечага грамадства.

**3. Змены клімату і ландшафту.** Эвалюцыйныя працэсы, час і маршруты рассялення людзей на кантынентах Зямлі, а ў далейшым развіццё і падзенне цывілізацый шмат у чым былі абумоўлены геаграфічным фактарам. Эвалюцыя чалавека адбывалася разам са зменамі ў прыродзе: мяняліся ўмовы надвор'я (клімат), мяняўся ландшафт мясцовасці.

Адны ландшафты былі спрыяльныя для жыцця ранніх людзей і не выклікалі патрэбы ў нейкіх пераменах. У іншых выпадках суровы клімат і бедны ландшафт не дазвалялі людзям жыць у гэтай мясцовасці. Але калі першапачаткова чалавек павінен быў прыстасоўвацца да ландшафту той ці іншай мясцовасці, дык з цягам часу стаў пераўтвараць яго для сваіх мэт.

На працягу доўгага перыяду фарміравання чалавека неаднаразова адбываліся пахаладанні, якія змяняліся пацяпленнямі. Такія ваганні клімату патрабавалі ад чалавека шукаць новыя шляхі выжывання, а ў выніку спрыялі развіццю мыслення і працоўных навыкаў, у тым ліку тэхналогій вырабу прылад працы. Але змены не былі хуткімі і дынамічнымі.

У гісторыі нашай планеты перыядычна адбываліся вельмі істотныя пахаладанні, якія прыводзілі да разрастання ледавіковых покрываў. Ледавіковыя перыяды працягваліся дзясяткі мільёнаў гадоў, у сваю чаргу, іх прынята падзяляць на ледавіковыя эпохі, на працягу якіх моцныя пахаладанні (абледзяненні) змяняліся на пацяпленні (міжледавікоўі).

Пашырэнне ледавікоў мела мноства наступстваў, якія аказалі непасрэднае ўздзеянне на развіццё чалавецтва. Так, адбывалася зніжэнне ўзроўню Сусветнага акіяна (на 100 м і больш), што прыводзіла да ўзнікнення сухапутных «мастоў» паміж участкамі сушы, раней падзеленымі вадой. У выніку падчас аднаго з абледзяненняў старажытныя людзі («чалавек прамаходзячы») здолелі рассяліцца па поўдні Еўразіі і пранікнуць на в. Ява (там былі знойдзены найбольш старажытныя косткі пітэкантрапа). Пазней краманьёнцы таксама змаглі перайсці ў Аўстралію і праз Берынгаў праліў у Паўночную Амерыку.

1. Успомніце з урокаў геаграфіі, што такое ландшафт.
2. Канкрэтызуйце прыкладамі вывад пра ўплыў геаграфічнага фактару на гістарычнае развіццё народаў.

### 4. Асваенне чалавекам тэрыторыі Беларусі.

**4.1.** Змена ландшафтаў, флоры і фауны была непасрэдна звязаная з наступленнем і адыходам ледавіка. Так, на беларускіх землях каля 100 тыс. гадоў таму пачалося апошняе паазерскае абледзяненне. Здаралася, на некалькі тысячагоддзяў халады адступалі, адбывалася пацяпленне. Менавіта тады на тэрыторыю Беларусі маглі пранікнуць першыя людзі. Іх увагу прыцягвалі буйны́я жывёлы — маманты і шарсцістыя насарогі, што жылі на прыледавіковай тэрыторыі.

У 12-м тыс. да н. э. ледавік пакінуў тэрыторыю Беларусі. Наступнае пацяпленне змяніла клімат, флору і фауну, якія наблізіліся да сучасных. Гэта адкрыла магчымасці для канчатковага засялення нашага краю.

**4.2.** *Устаноўлена новая дата першапачатковага засялення Беларусі*

Вучоныя ўстанавілі новую дату першапачатковага засялення Беларусі. Пра гэта паведаміў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім Лакіза. Ён прывёў прыклады, калі археалагічныя знаходкі апошніх гадоў дазволілі сапраўды змяніць уяўленне пра гісторыю. «Такіх прыкладаў мноства. Прычым па ўсіх храналагічных перыядах — ад першапачатковага засялення да Сярэднявечча і Новага часу. Калі мы кажам пра першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі, дык менавіта за апошнія гады вучоныя Інстытута гісторыі НАН зрабілі значныя адкрыцці. Мы давалі асцярожную ацэнку найстаражытнейшай стаянцы каля вёскі Огава. Спачатку 250 тыс. гадоў, потым не менш за 300 тыс. гадоў. Сёння мы кажам пра тое, што ёй не менш за 400 тыс. гадоў, таму што з'яўляюцца новыя прыродазнаўча-навуковыя аналізы, даныя, з якімі працуюць вучоныя».

Каля вёскі Кашэўнікі Гродзенскага раёна на рацэ Нёман археолагі знайшлі артэфакт узростам не менш за 100 тыс. гадоў. «А гэта значыць, што людзі ў раёне Гродна нашмат даўней, чым мы лічылі. Як мінімум у 10 разоў. Раней мы казалі пра 12 тыс. гадоў таму.

Праведзеныя намі даследаванні даказалі больш старажытную гісторыю цэлага рэгіёна. Як і раскопкі на яшчэ адной стаянцы старажытных людзей каля вёскі Навасёлкі Веткаўскага раёна — знойдзеныя артэфакты вельмі моцна паўплывалі на гісторыю рассялення людзей у каменным веку на тэрыторыі Гомельшчыны».

Крыніца інфармацыі: https://www.belta.by/amp/society/view/uchenye-ustanovili-novuju-datu-pervonachalnogo-zaselenija-belarusi-654337–2024

1. На падставе чаго беларускія вучоныя робяць вывад пра больш ранняе засяленне тэрыторыі Беларусі людзьмі?
2. Наколькі, згодна з адкрыццямі вучоных, павялічваецца «ўзрост» засялення тэрыторыі Беларусі людзьмі?
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся пра іншыя адкрыцці беларускіх археолагаў.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:
   — пра асаблівасці прафесіі археолага;
   — дзе ў нашай краіне можна атрымаць гэтую прафесію.